УДК 37.017.4:378

В. А. Кузьміч

# РЭАЛІЗАЦЫЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ ІДЭАЛОГІІ ПРАЗ ВЫХАВАННЕ РЭГІЯНАЛЬНАГА ПАТРЫЯТЫЗМУ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

“Рух наперад немагчымы без шчырай любові да Радзімы, да зямлі продкаў, да свайго народа. Патрыятызм праяўляецца не ў словах, лозунгах, а ў жыццёвай пазіцыі чалавека, у яго паўсядзённых справах”, – адзначыў кіраўнік нашай дзяржавы А.Р.Лукашэнка. Нездарма 2018 год быў аб’яўлены ў Беларусі Годам малой Радзімы.

Рэалізацыя дзяржаўнай ідэалогіі праз патрыятызм і патрыятычнае выхаванне моладзі з’яўляюцца прыярытэтнымі ў развіцці Рэспублікі Беларусь і ўвасабляюцца ў адукацыйным працэсе. З гэтай мэтай у БДТУ распрацаваны пастаянна дзеючы праект “Тут нашы карані” ў межах працы гуртка “Памяць” (кафедра беларускай філалогіі, (кіраўнік – Кузьміч В.А., дацэнт кафедры беларускай філалогіі, выдатнік адукацыі, заслужаны работнік адукацыі Беларусі). Праект прызначаны для арганізацыі пошукава-даследчай самастойнай працы студэнтаў па вывучэнні малавядомых старонак развіцця іх малой Радзімы; папулярызацыі і пашырэння рэгіянальнага турызму сярод беларускай моладзі; стварэння шматузроўневай інфармацыйнай мультымедыйнай сістэмы “Студэнцкая энцыклапедыя беларускіх рэгіёнаў”.

Даследаваны і творча апрацаваны малавядомыя старонкі гісторыі і развіцця малых рэгіёнаў Беларусі; прааналізаваны багаты навуковы, дакументальны і архіўны матэрыял па развіцці малых рэгіёнаў Беларусі, а таксама ўспаміны і інтэрв’ю блізкіх, родных студэнтаў і землякоў; падрыхтаваны багаты выставачны матэрыял; навуковыя працы, матэрыялы выступленняў на канферэнцыях. Атрыманыя вынікі актыўна выкарыстоўваюцца на лекцыйных і семінарскіх занятках па адпаведнай тэматыцы, падчас правядзення грамадзянска-патрыятычнай выхаваўчай працы са студэнцкай моладдзю, арганізацыі выстаў, канферэнцый, у тым ліку міжнародных, а таксама іншых мерапрыемстваў па адпаведнай тэматыцы і маюць бясспрэчную вартасць у межах пастаўленых дзяржавай ідэалагічных задач.